Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 48 (689). Wilnia, Niadziela 29 Listapada 1936 h. Hod XII (XX)

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na pałhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Студэнцкая завяруха ў Вільні і студэнты беларусы

Сёлета, з пачаткам заняткаў у вышэйшых школах у Польшчы, у некаторых местах час-адчасу сярод часьці польскае студэнцкае моладзі выбухалі проціўжыдоўскія забурэньні. Праявілася гэта грамадзкая хвароба акадэміцкай моладзі ў Львове, Кракаве, Варшаве, Вільні. Асабліва вострыя і несымпатычныя формы прыняла гэта хвароба ў Вільні. Пачатак, прабег і канец проціўжыдоўскіх выступленьняў часьці віленскай польскай студэнцкай моладзі выглядаў гэтак.

Больш-менш тыдні два таму студэнты, палякі, эндэкі, праўнікі Віленскага Унівэрсытэту зажадалі ад студэнтаў жыдоў, каб яны ў выкладовых залях сядзелі па левай старане, аддзельна ад хрысьціян. Жыдоўская моладзь, уважаючы гэткія дамаганьні польскіх студэнтаў крыўднымі для сябе і беспадстаўнымі, стасавацца да іх ня думала. Тады польскія студэнты пачалі ўжываць фізычнай сілы. Жыды разьбегліся. Рэктар і прафэсары нагаварвалі разьюшаных студэнтаў успакоіцца і ўзяцца за працу. Палякі студэнты паставілі свае варункі, заяўляючы, што яны толькі тады возьмуцца за навуку, калі Рэктар выдасьць афіцыяльны загад, каб студэнты жыды сядзелі на лекцыях асобна. Рэктар, ведама, адмовіў і спыніў у Унівэрсытэце заняткі аж да часу, пакуль студэнты не ўспакояцца. Польскія-ж студэнты нацыяналісты (эндэкі) сабраліся тады ў студэнцкім доме на Буфалавай Гары, лікам да 1000, і там замкнуліся, заяўляючы, што яны ня выйдуць адтуль, аж покуль ня будзе споўнена іх жаданьне. Пачаліся перагаворы. І студэнты і прафэсары стаялі на сваім. Тады студэнты аб'явілі галадоўку. Паўстаў непакой сярод бацькоў гэнай моладзі, а так-жа сярод прафэсароў на чале з Рэктарам. Занепакоілася нацыяналістычна настроена і польскае грамадзянства. Непакой гэты ўдзяліўся і грамадзянству жыдоўскаму, якое слушна пачало згадываць, што ўся гэта няцікавая гісторыя можа скончыцца на іх галаве. Пачаліся ўзноў перагаворы Рэктара з замкнуўшайся моладзяй. Рэктар рашуча адмовіўся выдаць афіцыяльны загад, каб студэнты жыды на лекцыях сядалі асобна. Тады бацькі гэных студэнтаў склікалі веча і выслалі дэлегацыю да Міністра Асьветы. Гэты цалкам падтрымаў Рэктара, заяўляючы адначасна, што ён хутчэй на цэлы год замкне унівэрсытэт чым згодзіцца выдаць загад, якога дамагаюцца польскія студэнты нацыяналісты. І Рэктар і Міністар выразілі сваю надзею, што справу мясцоў студэнты вырашаць дабравольным між сабой паразумленьнем. Студэнты палякі, якія ўжо былі пачаўшы галадоўку, а якая, відаць, ня надта трапляла ім да смаку, усё гэта палічылі за сваю «перамогу» і 23 гэтага месяца рана з гэнага дому выйшлі. Перад гэтым-жа хуліганы ў многіх жыдоўскіх крамах на галоўных вуліцах Вільні павыбівалі шыбы. Хто быў арганізатарам гэтага «гэройства», покульшто няведама. У унівэрсытэце дагэтуль нармальныя заняткі яшчэ не пачаліся.

Гэткі быў развой проціўжыдоўскіх выпадаў з боку польскіх студэнтаў нацыяналістаў. Мыляўся-б той, хто-б думаў, што гэта звычайныя блазанствы развыдранай, пераважна буржуазыйнай моладзі. Не. Гэта справа мае глыбейшы падклад. На нашу думку — гэта ёсьць адзін з праяваў польскага фашызму, польскага неаграніčанага нацыяналізму, які расьце і старанна гадуецца ў пэўных кругох польскага грамадзянства. Фашыстаўскі характар гэных выступленьняў польскіх студэнтаў відаць з заявы Рэктара, які сказаў, што ён не згаджаецца выдаць афіцыяльнага загаду, каб студэнты жыды займалі асобныя на выкладах месцы, бо «ён ня хоча быць першым у Польшчы рэктарам, які-б увёў у вышэйшай школе прынцыпы расізму». Знача, Рэктар гэныя проціўжыдоўскія дамаганьні ўважаў, як дамаганьні расізму ці свайго роду фашызму. Фашыстаўскі характар выступленьняў гэнай моладзі відаць так-жа і з веча бацькоў яе, якія сваю салідарнасьць з сваімі дзецьмі матывавалі, між іншым, тым, што быццам «чужы элемэнт, варожы польскаму народу, займае варштаты працы» і што гэта выклікае ў іх дзяцей зразумелае разгарычэньне. Дый агулам кожнаму думаючаму чалавеку ёсьць ясным, што асобныя мясцы і асобныя лаўкі — гэта ня прычына, а толькі зачэпка.

Такім чынам ясна ёсьць рэчай, што апошнія падзеі сярод акадэміцкай моладзі — гэта справа ня толькі польска-жыдоўская, а што яна датыча так-жа справы беларускай студэнцкай моладзі і справы беларускага народу агулам. Сяньня польскія фашысты ставяць свае дзікія жаданьні жыдом, а заўтра тое-ж самае могуць зрабіць беларусам. Словам, справа гэна немаральная сама ў сабе небясьпечная так-жа і для нас беларусаў. Беларускае студэнцтва, арганізаванае ў Беларускім Студэнцкім Саюзе і нават тое, якое да гэтага Саюзу не належа, за выняткам «мамчыных сынкоў», якія за польскую сачэўку прадалі сваё беларускае першародзтва, усю гэну студэнцкую завяруху разумее гэтак, як і мы, з ею не салідарызуецца і зганіла яе, выступаючы проціў разам з польскай дэмократычнай моладзяй.

Але моладзь як моладзь. На наш пагляд, беларусы студэнты да гэных студэнцкіх падзеяў не занялі *свайго беларускага, самастойнага становішча*. Не зрабілі, здаецца, гэтага і студэнцкія Саюзы літоўскі і украінскі. А шкада, добрая была нагода заманіфэставаць беларускім студэнтам сваё асобнае, беларускае, дэмократычнае становішча да гэных сумных фашыстаўскіх падзеяў і адначасна заманіфэставаць салідарнасьць студэнтаў беларусаў, літоўцаў і украінцаў. Магчыма, што йшчэ будзе час гэтую памылку паправіць...

Padhatoŭka da wybaraŭ sołtysaŭ i padsołtysaŭ

Sioleta ŭ listapadzie kančajecca termin trochletniaj kadencyi sołtysaŭ i padsołtysaŭ. Try hady tamu byli wybary sołtysaŭ i padsołtysaŭ pawodle nowaj samaŭradawaj ustawy, jakaja abawiazwaje i ciapier.

Treba spadziawacca, što skora buduć abwieščany nowyja wybary sołtysaŭ i padsołtysaŭ, jakija adbuducca pawodle wybarnaj ordynacyi henaj-ža nowaj samaŭradawaj ustawy.

Wybarnaja ordynacyja sialanstwu — wybarščykam užo wiedamaja z praktyki prošłych wybaraŭ. Praŭda, niadaŭna wydana ŭ hetaj sprawie rasparadžeńnie Ministerstwa Nutranych Spraŭ, jakoje źjaŭlajecca nowym rehulaminam paradku wybaraŭ sołtysaŭ i padsołtysaŭ, ale henaje rasparadžeńnie datyčyć tolki drobiazi farmalnaj, a hałoŭnyja pastulaty wybarnaha zakonu astajucca biaz źmieny. Ministerstwa swaim rasparadžeńniem tolki raźjaśniaje pastulaty wybarnaha zakonu, kab nia było padčas wybaraŭ roznajakasnaha tałkawańnia wybarnaj ordynacyi.

Hałoŭnyja pastulaty wybarnaha zakonu dziela wybaraŭ sołtysaŭ i padsołtysaŭ padajom asobna. Tut chočam adznačyć ważnaść i značeńnie sołtysa i padsołtysa ŭ hramadzkim žyćci wioski.

Pawodle nowaj samaŭradawaj ustawy wołaść dzielicca na hramady. Hramadu stanowiać: niekalki małych wiosak, małyja wioski z zaścienkami i chutarami, abo adna wialikaja wioska. Kožny žychar hetych wiaskowych asieliščaŭ jošć hramadzianinam danaj hramady i pawinien cikawicca wybarami adpawiednaha sołtysa i padsołtysa.

Sołtys — heta praŭnaja asoba, jakaja wykonwaje ŭsie sprawy, što naležać u samaŭradawym administrawańni da kompetencyi hramady. Jošć u hramadzie samaŭradawy orhan — hramadzkaja Rada, jakaja rašaje sprawy ŭ kruhu swajej kompetencyi, ale Rada ani swaich pastanowaŭ, ani zahadaŭ wojta i pastanowaŭ wałasnoj Rady nia wykonwaje. Hetyja funkcyi naležać da sołtysa i padsołtysa. Aprača hetaha, sołtys i padsołtys wykonwaje ŭsie čynnaści biahučych spraŭ. Słowam, sołtys z padsołtysam źjaŭlajucca ŭ hramadzie takim-ža orhanam, jak wojt z padwojtam i łaŭnikam u całaj wołaści.

Na hetym miescy chočam źwiarnuć uwahu na samuju instytucyju samaŭradu.

Samaŭrad ahułam maje wializarnaje značeńnie ŭ hramadzkim žyćci. Samaŭrad—heta ćwiordaja padstawa dziela hramadzkaha ładu i raźwićcia hramadzkaj pracy. Čym šyrejšy kruh dziejnaści samaŭradu i šyrejšaja, adpawiednaja intaresam danaj miascowaści jaho praca — tym mienšy i lahčejšy aparat ahulna-dziaržaŭnaj administracyi i šyrejšaje zacikaŭleńnie siarod nasielnictwa hramadzkim žyćciom; čym bolšaje zacikaŭleńnie nasielnictwa hramadzkim žyćciom — tym bolšaja pradukcyjnaść hramadzkaj pracy, a čym bolšaja pradukcyjnaść hramadzkaj pracy — tym lepšy dabrabyt u krai.

Stanowišča sołtysa nia tolki wykanaŭčaje zahadaŭ wojta, pastanowaŭ swajej hramadzkaj i wałasnoj Rady, ale tak-ža i stanowišča reprezentacyjnaje danaj hramady; sołtys — heta staršynia danaj hramady, jaki moža šmat čaho dobraha zrabić u swajej hramadzie ŭ supracoŭnictwie z hramadzkaj Radaj.

Dziejny sołtys u supracoŭnictwie z hramadzkaj Radaj moža dobra pastawić ŭ hramadzie sprawu zaškolnaj aświety, bo hramadzkaja Rada moža zakładać narodnyja damy, adčyniać biblijateki-čytalni i ahułam maje prawa pašyrać duchowuju i matarjalnuju kulturu.

Dziela taho, što sołtys u swajej dziejnaści źjaŭlajecca pamocnikam u wykanańni samaŭradawych i administracyjnych abawiazkaŭ wałasnoha samaŭradu i wojta, maje mahčymaść nawiazać kulturnuju i samaaświetnuju pracu ŭ swajej hramadzie z hetkaj pracaj u inšych hramadach i ŭ całaj wołaści.

Apračа hetaha, sołtys, jak pamocnik wojta, wykonwajučy sprawy administracyjnaha charaktaru, maje mahčymaść wystupać prad administracyjnymi ŭładami ad imia całaj swaje hramady ŭ sprawach patreb farmalnaści dziela prawodžańnia akcyi šyreńnia matarjalnaj i duchowaj kultury.

Hetkaja praca sołtysa wymahaje žyćciowaj praktyki i spraŭnaj dziejnaści. Kab być dobrym sołtysam, treba wiedać patreby sialan swajej hramady i chacieć dabra dla swajho narodu. Dobry sołtys pawinien być čaławiekam świedamym, wyrablenym i enerhičnym; prad usim pawinien być čaławiekam česnym, pawinien lubić swoj narod, umieć hramadzka pracawać i canić hramadzkuju pracu.

U kancy treba adznačyć, što ŭ našym Krai, dzie adbywajecca praces nacyjanalnaha adradžeńnia, sołtys pawinien razumieć hetuju sprawu i naležna da hetaha pracesu datarnawac-

24036+

Ад Школьнага Сакратарыяту

Прабег Школьнай акцыі высоўвае патрэбу зьвярнуць увагу Грамадзянства на наступнае:

1. Усе паўнамоцнікі і культурныя працаўнікі на вёсцы абавязкова павінны паведамляць Школьны Сакратарыят аб усім, што датычыць беларускага школьніцтва і складаньня школьных дэкляpацыяў. Трэба пісаць дакладна нават аб самых дробных рэчах, аб усялякіх перашкодах незалежна ад таго, зложаны дэкляpацыі Школьнаму Інспэктару ці не. Ня маючы ўсіх самых дакладных дадзеных, Школьны Сакратарыят ня зможа пакіраваць школьную акцыю на адпаведны шлях. Дзеля гэтага безадкладна прысылайце справаздачы **заказнымі** пісьмамі.

2. У выпадку, калі бацькі падпісалі дэкляpацыі, а войт катэгарычна адмовіўся сьведчыць подпісы, трэба падаць прычыны, якія сталі на перашкодзе да асягненьня **нашых законных** правоў, і разам з дэкляpацыямі прыслаць у Школьны Сакратарыят. Паведамленьні такія падпісваюць паўнамоцнікі і сяляне школьнага абводу.

3. Заявы, якія далучаюцца да школьных дэкляpацыяў пісаць у 3 х экзэмплярах. Адзін з дэкляpацыямі падаецца Школьнаму Інспэктару, другі з паквітаваньнем на зданыя дэкляpацыі прысылаецца ў Школьны Сакратарыят, а 3-ці, як копія, перахоўваецца ў паўнамоцніка.

4. Калі хто не атрымаў на свае пісьмы адказу ад Школьнага Сакратарыяту, ці пачкі з дэкляpацыямі, гэта значыць, што пісьмо і пачка не папалі па адрасу. Дзеля гэтага трэба пісаць нанава ў Школьны Сакратарыят **заказным**, ці шукаць аказіі, каб асабіста зрабіць усё ў Сакратарыяце.

Biełaruski Instytut
Haspadarki i Kultury
Vilenski Addzieł
Vilnia, Zavalnaja 1—1.

Pračytaj, sam pryjdzi i druhich pryviadzi.

PAWIEDAMLEŃNIE

U niadzielu dnia 29.XI.1936 hodu ŭ zali Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ Wilni pry Zawalnaj wul. 1—1 adbudziecca lekcyja na temu:

Mandžuryja, kraj i ludzi

1. Pryčyny i paŭstańnie palityčnaj farmacyi Mandžu-di-go.
2. Kitajcy i Japoncy ŭ Mandžuryi.
3. Napor i ŭpływy pazaazijackich dziaržaŭ.
4. Uschodnia-kitajskaja i paŭdzionna-mandžurskaja čyhunka.
5. Chun-chuz'y i ich dziejnašć.

Lekcyju pračytaje Ks. J. HERMANOVIČ.

Pačatak roŭna a hadzinie 17-aj. Uchod wolny i biaspłatny.

Urad Wilenskaha Addziełu BIHiK.

ca, kab nia škodzić hetaj naturalnaj prajawie i jak śled dawać joj mahčymašć swabodna, zhodna z prawam natury raźwiwacca. Dzieła hetaha najbolš pažadana, kab sołtysami i padsołtysami ŭ hramadach byli świedamyja biełarusy.

Hetkija wialikija i ŭsiestaronnyja wymohi ad ludzej, što pryjmajuć na siabie abawiazki sołtysaŭ i padsołtysaŭ, pakazwajuć nam, što ŭ hramadzkim žyćci sialanstwa wybary sołtysaŭ i padsołtysaŭ jošć wialikaj i ważnaj spraway.

Dzieła hetaha ŭsie wiaskowyja hramadzkija pracaŭniki i ŭsie świedamyja biełarusy na hetuju sprawu — na wybary sołtysaŭ i padsołtysaŭ, pawinny źwiarnuć naležnuju i ŭ adpawiedny čas uwahu.

p—k.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Канфіската „Шляху Моладзі.“ Адміністрацыйныя ўлады 26.XI. сканфіскавалі № 11 „Шляху Моладзі“ за м-ц лістапад 1936 г. Пасьля канфіскаты ўжо вышшаў чаргоўы № 12 гэтага часапісу беларускай моладзі.

Мнагалюдны вечар. Сёлета мінае 20 гадоў ад сьмерці беларускай паэткі і дзеячкі Цёткі. У мінулую нядзелю 22.XI. Віл. Аддзел Бел. Інст. Гасп. і Культ. пад старшынствам інж. А. Клімовіча, у сваім памешчаньні ладзіў акадэмію, прысьвечаную 20-ым угодкам сьмерці Цёткі. На акадэміі абсольвэнтка Віл. Унівэрсытэту М. Мілючанка прачытала вельмі цікавы рэфэрат аб паэтыцкай творчасьці і грамадзкай дзейнасьці Цёткі; творчасьць высокай поэтыцкай і грамадзкай вартасьці паэткі памастацку ілюстравалі падчас рэфэрату, дэклямуючы некаторыя вершы, студэнтка Сухая, мгр. Я. Хворост і інш. Пасьля рэфэрату беларускі хор грам. Р. Шырмы паказаў прысутным красу беларускай народнай песьні.

Трэба адзначыць, што на акадэмію ў чэсьць Цёткі зыйшлося многа народу, пераважна з работніцкіх серадовішч, запаўняючы залю і суседня пакоі памешчаньня Віл. Аддзелу БІГіК.

Тры суды. Усьнежні сёл. адбудуцца над б. рэд. „Б. Крыніцы“ Я. Пазьняком тры суды ў Віленскім Акружным Судзе: 1, 14 і 17 сьнежня; Суд будзе разглядаць справы канфіскатаў „Бел. Крыніцы“ № 11, 14 і 18 з 1936 г.

Узнаўленьне гуртка БІГіК. Сябры Бел. Інст. Гасп. і Культуры, якія мелі свой Гурток у Іказьні, Браслаўскага пав., каторы летась адміністрацыйнай уладай быў зачынены, пачалі захады дзеля ўзнаўленьня дзейнасьці свайго Гуртка.

З жыцьця беларускага студэнцтва. Беларускае студэнцтва Віленскага Унівэрсытэту, аб'яднанае ў Беларускім Студэнцкім Саюзе, сёлета наладзіла ўжо аж некалькі дыскусыйных вечароў; чарговыя гэтыя вечары адбыліся 21 і 24 г. м.

У суботу 28.XI БСС ладзіць у памешчаньні Віленскага Аддзелу БІГіК традыцыйны, гумарыстычны вечар: „Андрэйкі—Міколкі“.

— У сувязі з нападам на памешчаньне Рэктара У.С.Б, які меў месца ўночы з 22 на 23 XI б. г. Беларускі Студэнцкі Саюз зложыў дня 24.XI. б. г. праз вусны сваіх рэпрэзэнтантаў к к К. Грыгорчук і М. Шчорса пpорэктату праф. Пашкоўскаму пратэст і абурэньне з прычыны вышэй пададзенага факту.

U Litoŭcaŭ

REWIZIJA Ŭ STARŠYNI LITOŬSKAHA NACYJANALNAHA K-TU K. STAŠYSA. 23.XI sioleta, jak pisali polskija hazety, u Staršyni Litoŭskaha Nacyjanalnaha Kamitetu ŭ Wilni hram. Stašysa adbyłasia rewizija. Wyniki rewizii trymajucca pakulšto ŭ tajnicy.

Sprawu adłažyli 12.XI sioleta u Wilenskim Akružnym Sudzie mieła adbycca sprawa redaktara „V In. Rytojus“ za artykuł z dnia 20.XII.1935. Adwakat papraśiŭ dapytać nowych świedkaŭ. Sud da hetaha prychiliŭsia i sprawu adłažyŭ.

Pieraškadžajuć malicca. Z nahody świata Apieki Maci Božaj u Wostraj Bramie Litoŭcam praznačana na ich nabaženstwa 6 ja hadzina rana. Woś-žo, jak piša „Vil. Ryt“, polskija dewotki piajuć swaje pieśni a 6 i paźniej i takim čynam pieraškadžajuć litoŭcam. — Ad siabie možam dadać, što z biełarusami jšče horš, bo i ŭ kaściol puścić nia choćuć, jak heta stałasia z kaściołam św. Hanny.

Delehacyja da arcybiskupa. U pałowie hetaha miesiaca z Nowaświancian i z Radunia prybyła ŭ Wilniu litoŭskaja delehacyja i prywiezła prośby da Arcybiskupa. Delehacyja Nowa-Świancianskaja skaržyłasia na swajho probaršča, što jon nia ŭmieje palitoŭsku i źmianiaje na niekaryść litoŭcaŭ paradak nabaženstwaŭ u kaście. Radunskaja delehacyja prasiła arcybiskupa, kab što niadzieli była ŭ ich kaściele litoŭskaja nawuka i kab choć 8 dzion u hod možna im było ŭ kaściele piajać palitoŭsku. Arcybiskup, byccam dzieła poznaha času, delehacyi nia prynieŭ, a prośby jamu delehaty pieradali praz słuhu. — Słowam, stojka i wytrywała litoŭcy borucca za swaje prawy ŭ kaściele i służać pryhožym prykładam i dla biełarusaŭ.

Kanfiskata. 19.XI sioleta zahadam starasty m. Wilni byŭ skanfiskawany Nr. 92 „Viln. Rytojaus“ za dwa artykuły.

I začyniajuć i spryniajuć. Świan-

Др. Ст. Грынкевіч. 10)

У братоў украінцаў.

ПРОМЫСЕЛ І ГАНДАЛЬ.

На пачатку агульная заўвага. Гаворачы аб промысьле і гандлю — маю наўвеце украінскія, саматужныя, больш ці менш вырасшыя, гэныя дзелянкі жыцьця, а ня цікую аб промысьле і гандлю на украінскай крытэрыі Галічыны, з чужым капіталам, чужымі, далёкімі імкненьнямі. Думаю, што для тых з нас, хто едзе ў Львоў перадвеенны, ці на'т 12—15 гадоў таму назад, будзе неспадзеўкаю вялікі зрух украінца-хлебароба з сяньняшняю цягаю ў горад да варштату і ляды ў краме. Бязумоўна былі паасобныя ўстановы, прысьвечаныя эканамічным украінскім цікаваньням недзе ўжо ў XIX стагодзьдзі,—пачалася тады кооперацыя, паявіліся першыя банкі, аднак кооперацыя вытворчая была надта слабая, а банкі і колькасна і паводле аб'аротных капіталаў зусім не адказвалі суадносінам паміж насельніцтвам.

Дык можна казаць, што украінскі промысел і гандаль зьявішча пасьляваеннае, ды на'т, што гэта падзеі апошніх дзесяцігадоў. І трэба было-б асабліўшым націскам падчыркнуць, што ўсё часьцей і часьцей бачым прыватную ініцыятыву ў гэнай галіне працы людзей, якіх мы ня прывыклі тутака бачыць — паіменна інтэлігентаў. На заходзе Эўропы, у Амэрыцы зьявішча нармальнае і зразумелае, што дырэктарам вялікага прадпрыемства быў чалавек, які пачынаў кар'еру ад чорнае работы, а з другое стараны не выключала ў нікога зьдзіўленьня, што інжынер хадзіў у рабочай блюзе ня толькі дзеля фасону, але дзеля таго, што сапраўды працаваў часта за адным станком з работнікамі. Украінская даваенная інтэлігенцыя была ўзгадаваная, бяручы агулам, з думкаю, што здабудзе месца на дзяржаўнай службе, у стане духоўным; меней часта, ці на'т зусім рэдка, людзі йшлі ў „вольныя прафэсіі“— лекарскую, адвокатуру. Зусім вынятковa йшлі на тэхніку і гандаль. Гэта была праява і адначасна адказ нутраное няпэўнасьці сваіх сілаў, бязверра ці прынамся недавер у свае магчымасьці, уканцы ня было собскіх капіталаў, якія заахвочывалі-б адзінкі да таго, каб брацца за новую работу. Наканец яшчэ быцам нейкія панска шляхоцкія адносіны народу хлебаробаў і пастыроў да гандлю. Гэта мамэнт, трэба думаць, які іграў вельмі важную ролю ў тым, што ня толькі інтэлігенты, але ўся маса сялянская быццам баялася ўзяцца за вагу і мэтр ды сесьці за свой маленькі варштат. Гэтым, здаецца, трэба было-б паясьняць тое зьявішча, што эмігранты найчасьцей вароч алісе са здабытым на чужыне капіталам на загон, прасякнуты потам іхных дзядоў і прадзедоў, а зусім вынятковым зьявішчам было, каб „эмыгранец“ ці агулам былыя фабрычны работнік імкнуўся наладзіць новую пляцоўку працы.

Усебаковае дасьпяваньне народу, вялікія ваенныя падзеі, рэвалюцыя, спроба наладзіць собскі дзяржаўны апарат, перамена краёвых, пасьляваенных суадносінаў — усё гэта глыбокім плугам перагарала псыхіку народу і ўзгадавала новы тып адзінкі. Можна шкадаваць колішні тып, можна лятуцець да „старое, добрае пары“, аднак жыцьцё паклікала новага чалавека — украінца і гэны новы чалавек рэалізуе новую украінскую сучаснасьць, а ўсьлед за гэтым і будучыню.

Украінскі промысел і гандаль яшчэ тым асаблівы, што яны зусім саматужныя, бяз чужога капіталу і ні ў чым не падобны да прыкладаў найбольш блізкіх, значыцца да польскага ці расейскага. Яны новыя, прабойныя, і дэмократычныя, адначасна-ж шчыра нацыянальныя сваім зьместам, наколькі можна гаварыць аб нацыянальным зьмесьце ў малой фабрыцы, у мястовай ці вясковай краме.

Прэса ад пары да пары паведамляе аб націску, які робіць вёска на жыдоўскія мястэчкі. Бяз ніякіх антыжыдоўскіх эксцэсаў, без пагромаў адна за аднэю жыдоўскія крамы ліквідуюцца, а на іх месцы сядае селянін. Ня толькі крызыс, цесната на вёсцы і малазямельле спанукаюць хлебароба да выхаду з вёскі, але тое нешта новае, што перамяніла украінскую душу ды без чаго, гэта трэба сабе ўявіць і ўбіць у памяць, ня можа зьдзейсьніцца заўтрашняя Украіна.

Гэта агульная асноведзь паасобных фактаў, з якіх аканчальна тчэцца рэчаіснасьць. Рэчаіснасьць далёка не такая романтычная, пазорная, рыцарская. Рэчаіснасьць — гэта штодзеннае, упорыстае змаганьне, вельмі цяжкая натуга, гэта беспераpыўны экзамін сьпеласьці і росту. Скажам „Дэндра“, адно з прадпрыемстваў ці на'т фабрыкаў украінская львоўскага „Манчэстра“, як кажа п. А. Курдыдык, які ветліва схацеў паказаць нам украінскі промысел. Сяньня фабрыка прадукуе 140 тоннаў шавецкіх шпіляк, працуе ў ёй пару дзесяткаў людзей. Фабрыка здабыла львоўскі рынак дзеля сваіх прадуктаў, робіць памысныя спробы ў Варшаве, Пазнані. Існуе ўсяго два гады. У фабрыцы інжынер зьяўляецца адначасна дырэктарам гандлёвым, галоўным майстрам, шэфам канцыляpыі і ўсім, чым толькі хацець. «Дэндра»—прадпрыемства прыватнае. Наладзіла яго двох безработных інжынераў, якія не хацелі бадзяцца бяздзейна і ждаць перамены коньюктуры, якія ня думалі больш аб магчымасьці такое ці іншае „пасады“ і ўзяліся за работу. Між іншым работа гэная не ляжала па лініі іх найбліжэйшае адумысловасьці. Узяліся за гэта, дзеля таго, што адзіная краёвая фабрыка шавецкіх шпіляк была без конкурэнцыі, давала паганы тавар па высокіх цэнах. Рызыка была, капітал вельмі аграничаны, была затое маладая вера, ахвота, а ўжо цераз два гады вялізарны эфэкт. А як яны шукалі рынку на свой прадукт? Ня мелі агентаў, ня мелі кантораў рэклямы, ня мелі грошаў на гэта. Рабілі ўсё гэта паапостальску. Ад шаўца да шаўца, ад крамы да крамы. А там ужо дайшлі да гур-

Prad pryniaćciem nowaj kanstytucyi ŭ SSSR

Sioleta wiasnoj Centralny Wykanaŭčy K-t SSSR zaćwierdziŭ prajekt nowaj kanstytucyi i pastanawiŭ sklikać na 25 listapada sioleta Kanhres Sawietaŭ SSSR, kab hety prajekt razważyć i pryniać, jak abawiazwajučyja zakony.

Ab hetym prajekcie nowaj sawieckaj kanstytucyi my zbolšaha ab hałaŭniejšych punktach jaje ŭ swoj čas pisali. Ciapier, kali ŭ Maskwie Kanhres Sawietaŭ SSSR radzić nad usimi punktami hetaj kanstytucyi, my źwierniem uwahu na tyja hałoŭnyja parahrafy ŭ joj, jakich prošłym razam nie zakranali.

Treba spadziawacca, što Kanhres Sawietaŭ paprawak u prajekcie kanstytucyi rabić nia budzie. Dyk biarom źmiest prajektu.

Nowaja sawieckaja kanstytucyja składajecca z wialikich čatyroch čaściej: 1) — **ułasnaść**, 2) — **suadnosiny miž nacyjanalnymi respublikami, jakija stanowiać i centralu SSSR**, 3) — **wybary**, 4) — **hramadzkaja swaboda.**

1) U toj čaści kanstytucyi, dzie haworycca ab ułasnaści, u parahrafie 10-tym skazana hetak: „dachody z prywatnaj ułasnaści hramadzian, dachody z ichnaj pracy, aščadnaści, dom dla pamieščańnia i chatnija, haspadarčyja pryłady acharaniajucca prawam“.

Niekatoryja socyjalisty i apazycyjnyja kamunisty ćwierdziać, što hety parahraf kanstytucyi rasšyraje darohu dziela prywatnaj ułasnaści i kapitalizacyi. Na naš pahlad, sam źmiest hetaha parahrafu ab takoj „swabodzie“ dziela raźwićcia prywatnaj ułasnaści jašče ničoha nie haworyć.

2) Ab suadnosinach miž nacyjanalnymi respublikami haworyć parahraf 17 kanstytucyi, jaki dazwalaje kožnaj z 11 nacyjanalnych respublik (u hetym liku i Biełaruskaj Socyjalistyčnaj Sawieckaj Respublicy), jakija stanowiać SSSR (Sajuz Sawieckich Socyjalistyčnych Respublik) na swabodnaje wystupleńnie z SSSR.

Ale chto ž zdumaje addzialacca? — Chiba tolki niekamunisty! A treba wiedać, što i hetaja kanstytucyja addaje ŭładu ŭ SSSR tolki kamunistym, jakija partyjna źwiazany i biez kanstytucyi sučasnaha SSSR wuzłami abjadnańnia pad ściaham Kaminternu.

3) Wybary, pawodle nowaj kanstytucyi, majuć być ahulnyja i tajnyja. Ale treba wiedać, što pawodle parahrafu 141 hetaj kanstytucyi, kandydataŭ na pasłoŭ moža padawać tolki kamunistyčnaja partyja i źwiazanyja z joj arhanizacyi moładzi, kulturna-aświetnyja, prafesyjanalnyja i inšyja, a parahraf 142 daje prawa adklikać pasłoŭ z parlamantu bolšaściaj hałasoŭ danaha wybarnaha wokruhu.

Trocki — zaŭziaty apazycyjaner sučasnaha režymu ŭ SSSR u hetym bačyć likwidacyju dyktatury praletaryjatu, likwidacyju sawieckaj systemy i pierachod da systemy „plebiscytowaha bonapartyzmu“. Na naš pahlad, daloka tam jašče da hetaha „plebiscytowaha bonapartyzmu“, bo całaść ułady kamunistyčnaj partyi astajecca niepadzielnaja i nadalej.

4) Ab hramadzkaj swabodzie kaža parahraf 125 kanstytucyi— ab swabodzie druku, arhanizacyi i schodach, ale parahraf 126 pajaśniaje, što lehalnaj partyjaj źjaŭlajecca tolki kamunistyčnaja partyja.

Z hetaha ŭsiaho jasna, što nowaja kanstytucyja, jakaja ciapier na warštacie Kanhresu Sawietaŭ SSSR, maje charaktar monopartyjny.

---

cianski pawietawy starasta („Vıln. Ryt.“ Nr. 93) pawiedamiŭ Centralny Urad T-wa św. Kazimiera ab začynieńni i spynieńni dziejnaści całaha radu addziełaŭ hetaha T-wa ŭ tym-ža Šwiancianskim paw.

Razrost presy. Ad 1.XII sioleta miesiačny žurnał dla moładzi „Jaunimo Draugas“ maje wychodzić dwa razy ŭ miesiac, „Viln. Žodzis“, jaki dahetul wychodziŭ try razy ŭ miesiac, maje być tydniowikam, a nieperyjodyčny „Lietuviškas Baras“ maje być miesiačnikam.

U sprawie litoŭskich nabaženstwaŭ. Nr. 90 „Viln. Ryt.“ padaje nastupnaha źmiestu karespandencyju z Kałtynian, Šwiancianskaha paw.

— U Kałtynianskaj parafii 3 z pałowaj tysiačy parafijan, u ich palakoŭ tolki kala 300. Dadatkowyja nabaženstwy ŭ kaściele zaŭsiody byli palitoŭsku, papolsku była nawuka kožnaj niadzieli pa niešpary. Apošnim časam palaki zažadali, kab polskaha nabaženstwa było bolš i ŭ hetaj sprawie padali arcybiskupu prośbu. Prociŭ hetaj prośby litoŭcy padali swaju prośbu, jakuju padpisali 2062 asoby. Litoŭcy dakazwajuć, što dahetulešniaha paradku nabaženstwa ŭ Kałtynianskim kaściele źmianiać na karyść palakoŭ nia treba, bo jany mała chodziać u kaścioł i mała karystajuć z taho, što majuć. — Jak bačym, litoŭcy ŭ roznych kutkoch našaha kraju ŭporysta baroniać prawoŭ swajej mowy ŭ kaściele. Hetak i treba!

Niamieččyna pastupowa zrywaje Wersalski dahawor

Pawodle Wersalskaha dahaworu spłaŭ wialikimi rekami, jakija pływuć praz Niamieččynu, abniaty mižnarodnym prawam i byŭ pad kantrolaj specyjalnych mižnarodnych kamisijaŭ, i pa hetych rekach mieli darohu ŭsie dziaržawy, jakija apłačwali wyznačanuju taksu mižnarodnaj spłaŭnaj taryfy. Ciapier niamiecki ŭrad admowiŭsia padlahać hetamu mižnarodnamu prawu i sprawu spławu hetymi rekami na niamieckaj terytoryi ŭzaležniŭ ad siabie.

Hety pastupak niamieckaha ŭradu wyklikaŭ abureńnie ŭ niekatorych dziaržawach, asabliwa ŭ Francyi, ale suproć hetaha ani Anhlija, ani Italija nie zapratestawali.

Hišpanski ŭrad staić za respublikanska-parlamentarny ład

Fašysty i ich prychilniki ŭściaž dakazwajuć, što hišpanski ŭrad, suproć jakoha paŭstali fašysty na čale z hienerałami Franco i Molo, zawodzić u Hišpanii sawiety i ahułam dyktaturu kamunistyčnaj partyi. Tymčasam zusim nia toje robić i choča rabić respublikanski ŭrad u Hišpanii.

Nadowiačy premjer uradu Largo Kaballero padaŭ da publičnaha wiedama hetkija pastulaty:

Respublikanski ŭrad nia maje namieru zawodzić u Hišpanii sawieckaha ładu; hałoŭnaj zadačaj uradu jość utrymańnie respublikanska-parlamanckaha ładu, takoha, jaki stworany kanstytucyjaj, jakuju narod Hišpanski sam sabie, majučy poŭnuju swabodu, ustanawiŭ. Pryhetym premjer Kaballero zajawiŭ, što prahrama jaho ŭradu — abjednańnie ŭsich demokratyčnych siłaŭ, hatowych baranić parlamanckaj swabody suproć fašystaŭskaj dyktatury. Najbližejšaja sesija parlamantu ŭ Walencyi — ćwierdzić premjer Kaballero — budzie symbalem hetkaha ahulnaha abjednańnia ŭradu z wializarnaj bolšaściaj narodu Hišpanii.

Niamiecka-japonski sajuz suproć balšawikoŭ

Ab sajuzie Niamieččyny z Japonijaj suproć Sawietaŭ užo daŭno pišuć hazety. Dasiul aficyjalnyja čyńniki hetych dziaržaŭ da hetaha sajuzu publična nie pryznawalisia i hetkija wiestki zapiarečwali. Ciapier užo stała wiedama i aficyjalna, što pradstaŭniki japonskaha ŭradu z pradstaŭnikami ŭradu niamieckaha hetki dahawor suproć balšawikoŭ 25 listapada sioł. u Berlinie padpisali.

Roznyja wiestki

ZHAZET.

Ab pieranasialeńni našaha Kraju. Klerykalna-endeckaja hazeta „Mały Dziennik“ z nahody tydnia „Ligi Morskiej i Kolonialnej,“ jaki adbywaŭsia ŭ Wilni ŭ minułym tydni, źmiaščaje artykuł „Kresy potrzebują kolonii,“ u jakim zwaračwaje ŭwahu na pieranasialeńnie ŭ našym Krai, dakazwajučy patrebu emihracyi našych ludziej, kab razredzić pieranasialeńnie.

Sapraŭdy naš Kraj husta zasieleny i dla našaha nasielnictwa treba šukać warštatu pracy, ale naŭpierad u sprawiadliwaj ziamielnaj reformie ŭ Krai, a paśla sposabam emihracyi.

Pryhetym treba śćwierdzić, što hetym artykułam „Mały Dziennik“ pryznaje, što ŭ našym Krai ciesnawata i dla miascowaha nasielnictwa, i dla asadnictwa tut abšaraŭ niama. Dyk dziela jakich pryčyn i našto hety samy arcykatalicki „Mały Dziennik“ nia raz zaklikaŭ u ńaš Kraj polskich kalenistaŭ?...

Čutki ab polskim Sojmie. U polskaj presie pajaŭlajucca čutki, što sučasny Sojm i Senat adbudzie hetaj zimoj ŭžo apošniuju sesiju i pryniaŭšy dziaržaŭny budžet, budzie raźwiazany; paśla raźwiazańnia Sojmu buduć wyznačanyja nowyja wybary.

Treba adznačyć, što ciapierašnim Sojmam niezdawoleny nia tolki apazycyja, jakaja nia brała ŭčaścia ŭ apošnich jaho wybarach, ale niezda-

---

тоўні, а там бачыш высылаюць вялікія транспарты ў далёкую Варшаву і яшчэ далейшы Пазначь. Ясна, што фабрыка гэта ня толькі прыгожыя лятуценьні. Тутака дакладная, зважная калькуляцыя. Промыслу і гандлю ня можна будаваць на сэнтымэнце. Сэнтымэнт, гарачае пачуцьцё, ідэальнаю можа быць пружынаю. розум цьвярозы, востры зьяўляецца, каб павесьці імкненьні, і прысутнасьць ягоная неабходная.

Шмат іншых прадпрыемстваў ці ў Львове, ці ў Станіслававе, ці Косаве ці дзе йшчэ на Галіцкай зямлі, пачыналіся аднолькава, як «Дэндра,» ці мо' йшчэ больш скромна. Скажам выраб шчотак. Цяжка знайсьці купцоў на шчоткі. Безработная сям'я за апошнія грошы купляе сырэц і пасьля навукі рамясла пачатна прадукуе на дзень 6 шчотак. Упорыстая воля перамагае ўсе заміны. Пачатна і свае гандлёвыя ўстановы, коопэратывы, прыватныя крамы, бяруць шчоткі ад новае фірмы неахвотна. Чалавек з натуры сваей консэрватыст. Стары дзядзька бачыць, што плуг лепшы за саху, а падумаўшы крышку, дайшоў бы ён да вываду, што калькуляцыя грашовая дыктуе яму брацца за плуг, аднак доўга йшчэ будзе ён бараніць сахі. Сахою гараў бацька і дзед, як яму кідаць нешта блізкае, вядомае, а брацца за новае, хаця мо' і лепшае. Тое самое заўсёды і ўсюды, асабліва пры старадаўным складзе характару хлебаробаў. „Фабрыкант“ шчотак умее пераканаць, дамагаецца сабе месца і бачым вельмі хутка ён прадукуе ўжо 100 шчотак на дзень, ужо ў яго работнікі чужыя, свае сям'і не хапае. Фабрыкант верыць, адначасна не пакладае рук, а дзейна памагае, каб лёс паказаў яму больш ясную старану.

Большасьць прамысловых установаў пачынала свае падзеі таксама, як „Дэндра,“ як прадукцыя шчотак. Бязумоўна гэныя новыя асяродзішчы працы ня былі оазамі на пустыні, якая аддзеляла іх ад масаў насельніцтва, дзеля якога прадукавалі шторазь новыя прадметы.

Свая коопэрацыя, свая прэса, высокі ровень нацыянальнае сьведамасьці былі зарукаю памыснасьці ў працы. Дык сякія-такія ўмовы былі, трэба было толькі ўмець іх выкарыстаць.

На выстаўцы роднага промыслу, зладжаннай сёлета вясною ў Львове, былі прадстаўленыя 53 украінскія фірмы. Выстаўка гэная была паказальнікам жыцьцёвасьці, натуральнасьці разьвіцьця промыслу і гандлю.

Ня было там аднабокасьці. Хоць ня маюць сяньня украінцы асобнае цэнтральнае ўстановы дзеля рэгуляцыі падзелу і прыдзелу ў паасобных адумысловасьцях, аднак грамадзкая сьпеласьць, шырака распаўсюджаная прэса рэгулююць як найлепш падзел працы.

На вышусгомненай выстаўцы было крыху старых фірмаў, якія існавалі некалькінаццаць ці некалькі дзесяткаў гадоў, у большасьці аднак былі маладзенькія ўстановы, што змагаюцца некалькі гадоў ці на'т некалькі месяцаў. Вельмі цікаўныя назовы паасобных прадпрыемстваў „Дэкора“ — фабрыка картонаў; „Эргон“ — займаецца радыем; „Атра“ — чарнілам, „Біблёс“ — сшыткамі; „Этан“ — прадукуе алавікі, ляк, гуму, „Тэ-бэ“ — трансмісыйныя паясы, пугі і іншыя вырабы са скуры; „Фамоза“ — мыла, «Эко“ — займаецца электрыфікацыяй, электрычнай інсталяцыяй. „Вэсэлка“ — выробляе ніці, розныя кравецкія прылады. „Око“ — артыстычная кераміка, „Комэта“ — тэкстыльны промысел, выробляе палатно, шалікі і г. д. „Алёэ“ — косметычныя прадметы, прыкладам пудра, паста да зубоў і г. д. «Калына“ — фабрыка гільзаў да папяросаў, „Кэрос« — сьвечкі, далей ўсякія мо' і чужыя назовы, як „Ароза,“ „Сільва,“ „Хром,“ „Карпаты“ і г. д., і г.д. Амаль што ня ўсё, што патрэбнае ў штодзенным жыцьці селяніну, інтэлігенту, вучнёўскай моладзі, усё, што патрэбнае ў кухні, у хатняй гаспадарцы, усё неабходнае дзеля элегантнае жанчыны, мужчыны, — усё можна знайсьці ў сваіх людзей, зробленае рукой сваіх работнікаў неанонімова. Рознаякія мянюшкі фірмаў, трэба думаць, выкліканыя новамодным духам часу, а побач гэтага мо' праяўляецца тутака права мімікры. Гандлёвая конкурэнцыя мае свае асаблівыя законы, якіх ня зломіш. Усякае, „Алёэ,“ „Кэрос,“ «Амара“ лягчэй нойдзе на агульным рынку купцоў як скромная „шавецкая шпілька,“ „нашая сьвечка“ ці што йшчэ. Гандаль кіруецца своеродною псыхалёгіяю і трэба яе ведаць і да яе датарнавацца, ня хочучы прайграць у змаганьні.

Паміж фірмамі блізу на 50 проц. ёсьць коопэратыўных установаў ці супалак. Да аднае з вялікшых такіх належыць „Кір“ (коопэратыва работаў інжынерскіх), што мае тры аддзелы — будаўляны, фабрыка батэрыяў і электротэхнічны. Другая палова прадпрыемстваў вырасла з прыватнае ініцыятывы. Трэба, здаецца, зьвярнуць увагу і падчыркнуць, што 50 проц. у новай галіне промыслу і гандлю належыць да коопэрацыі, а трэба-ж яшчэ помніць на „Маслосоюз,“ „Народню Торговлю“ ды шмат яшчэ якія іншыя пабудованыя на аснове дзі коопэрацыі, дык тады ўявім сабе вялізарнае зразуменьне і шырокае распаўсюджаньне ў масах ідэі коопэрацыі.

Хочучы мераць на амэрыканскую меру, ці на цыфру буйнага эўропэйскага промыслу украінскія пачыны, дык цыфра 3.500 людзей, занятых у „украінскім манчэстры“ ў Львове будзе сьмешнаю драбязой. Зусім інакш выглядае гэта са стараны натугі, колькасьці энэргіі і тымі пэрспэктывамі, якія адчыняюцца перад нацыянальным імкненьнем да незалежнасьці. Сапраўды, ані агульнае багацьце, ані агульнае шчасьце, ані агульнае здароўе ня мерaецца вялікімі фабрыкамі чужога капіталістага, ці роскашшу ягонага жыцьця, як ровень здароўя масаў ня мае нічога супольнага з дасягненьнямі, рэалізованымі паасобнымі адзінкамі з патолёгічна пераросшымі органамі.

Украінцы стаяць на добрым шляху ў рэалізацыі сваіх імкненьняў.

wolenyja užo i tyja kruhi, što špiarša stajali haroj za jaho.

Chodziać čutki, što pasoł hien. Želihoŭski maje na hetaj sesii Sojmu skazać apazycyjnuju pramowu, u jakoj bu izie krytykawać uwieś sučasny režym, a paśla razam z swaimi sympatykami zrakucca pasolskich mandataŭ.

Polskaja presa padaje, što apazycyja nastojliwa wymahaje raźwiazańnia hetaha Sojmu i pryhetym zajaŭlaje ab účaści ŭ nowych wybarach tolki tady, kali nowaja wybarnaja ardynacyja budzie zusim demokratyčnaja i kandydaty ŭ pasły nia buduć zaležnyja ad adnaje partyi.

Z POLŠČY

Nowaj palityčnaj arhanizacyi jašče niama. Šyroka wiedamaja padhatoŭka pałk. Kocam prahramy nowaj palityčnaj arhanizacyi, jakaja, pawodle hazetnych wiestak, mieła być abwieščana 11 listapada, jašče nia wiedamaja. Hazety pišuć, što jaje i nie abwieściać, bo z jo nie zhadžajucca i mnohija pasły ciapierašniaha Sojmu; a hetaja-ž arhanizacyja byccam i mieła na mecie ŭ pieršuju čarhu abjadnać usich pasłoŭ i sanataraŭ.

Antysemityzm siarod studentaŭ, Waršaŭski uniwersytet začynieny. Hetymi časami polskija studenty, endeckich pahladaŭ, na uniwersytetach pačali kałatniu antysemickaha charaktaru; studenty nacyjanalisty stawiać uniwersyteckim uładam suproćzakonnyja damahańni wyrazna antysemickaha charaktaru. Uniwersyteckija ułady, wiedama, hetkija damahańni adkidajuć. U Waršawie studenty „akupawali" uniwersyteckija zali. Ministar Aświety za heta uniwersytet začyniŭ.

Pensii i zarabotki. Skarbowaja statystyka padaje, što ŭ Polščy zarablajuć miesiačna: pa 240 zł. 31 z pałowinaj tysiač asob, pa 270 zł.—28 tysiač asob, pa 300 zł.—30 z pałowinaj tysiač asob, wyšej 500 zł.—19 z pałowinaj tysiač asob, kala 800 zł. — 44 z pałowinaj tysiač asob, wyšej 1000 zł —13 z pałowinaj tysiač asob, pa 2500 zł. — 11 tysiač asob, pa 5000 zł. — 3 tysiačy asob, wyšej 6000 zł. — 1500 asob.

Heta, jak bačym, klasa zamožnaja. Cikawa pakolki zarablajuć ad 240 zł. uniz; wiedajem z praktyki, što padzionnyja rabotniki zarablajuć pa 2 zł. 50 hr. — 3 zł. dzienna.

Z ZAHRANICY

Z frontu wajny ŭ Hišpanii. Apošnimi dniami paŭstancy pierastali pieramahać respublikancaŭ. U Madrydzie užo bolš dwuch tydniaŭ bjucca fašysty z respublikancami; cito ŭ Madrydzie pieramoža, jašče hadać trudna. — Nawokał hetaj hišpanskaj wajny, apošnimi časami nadta-ž pačali spłatacca intaresy roznych dziaržaŭ; za Niamieččynaj i Italijaj, jakija pamahajuć fašystam, prypływajuć tudy z pomačaj respublikancam karabli z Sawietaŭ, Meksyki, pamahajuć tak ža z Francyi i pačała tudy padpływać užo i anhielskaja flota. Z hetaha može zaharecca pažar wajny i miž eŭropejskimi dziaržawami.

Čarhowy prysud śmierci ŭ SSSR. U minułym tydni ŭ Nowasibirsku adbyŭsia sudowy praces nad 9 asobami, abwinawačanymi za sabataž i špijonstwa. Siarod hetych 9 abwinawačanych jošč hramadzianin Niamieččyny inž. Stickling. Usie abwinawačanyja zasudžanyja na karu śmierci. Centralny Wyk. K-t SSSR troch zasudžanych, u hetym i inž. Sticklinga, pamiławał i zamianiŭ karu śmierci na 10 hadoŭ katarhi; rešta zasudžanyja 6 asob rastrelany. — U Arle zasudžany na karu śmierci za katastrofu ciahnika mašynist i kanduktar.

Грамадзяне! У кожнай беларускай хаце павінен быць беларускі календар!

Piśmy z wioski

Biełaruskaja świedamaść.

Župrany, Ašmianskaha paw. Nacyjanalnaja biełaruskaja świedamaść u nas uściaž pašyrajecca. Hady dwa tamu nazad na poštu ŭ Župrany nia prychodziła ani adna biełaruskaja hazeta, a ciapier niama ŭžo ŭ Župranskaj parachwii wioski, u katoraj niama biełaruskaj knižki. Praŭda, moładź naša jašče zapiswajecca ŭ čužyja arhanizacyi — „Strzelec," „KSM" „Młodzież Wiejska," ale heta tolki dziela čysta materjalnych metaŭ. Zapisaŭšysia ŭ „Strzelca" nia treba płacić wajskowaha padatku, a zapisaŭšysia ŭ „KSM" i inšyja polskija arhanizacyi možna mieć lepšy ŭzhlad na siabie ksiandza iz wałasnych da pastarunkowych wakon. Ideowa zaŭsiody adnak zdaloku trymajucca ad polščyny. Swaich, biełaruskich arhanizacyjaŭ niama i niama ich mahčymaści zasnawać.

Nie biaz recha prajšoŭ u nas sioletni ŭzdym biełaruskaha sialanstwa ŭ damahańni rodnaj škoły. Dokazam hetaha jošč fakt, što na Zaduški (kiermašny dzień u Župranach) raźwiešany adozwy „Za rodnuju školu."

Kančajučy, treba adciemić, što pieradawymi i stojkimi pracaŭnikami na niwie biełaruskaha adradžeńnia źjaŭlajecca ŭ nas najmałodšaja moładź, zachoplenaja idejaj, i hetaja moładź poŭna entuzyjazmu i nia ličycca z nijakimi trudnaściami, śmieła pašyraje biełaruskaje drukawanaje słowa i jak mahа pryčyniajecca da pašyreńnia biełaruskaj świedamaści. Sława maładym pijaneram!

Zupranski.

Ab žyćci ŭ wioscy i na chutaroch.

Kimiany, Šumskaj woł., Wil.-Trockaha paw. U 1929 h. pačałasia prawodzicca chutaryzacyja našaj wioski: na žadańnie niekatorych sialan pryjechaŭ ziamielny kamisar i pačaŭ chutaryzacyju. Nia ŭsie chacieli pierachodzić na chutary i było z hetym wialikaje zmahańnie.

Mnohim sialanam było nadajeŭšy wiaskowaje žyćcio — nadajeła abciracca bok kala boku i apasywać wuzieńkija šnurki adzin druhomu.

Treba adznačyć, što našaja wioska niewialikaja, ale na wuzieńkich šnurkoch nadta-ž była husta pasialena, dyk razsialacca treba było.

Komasacyja prajšła i sialanie dastali swaje chutary. Pačałosia nowaje hora; treba było pieranosić budynki. Na chutaroch pačałosia nowaje žyćcio, ale jšče ciažejšaje za staroje, wiaskowaje. Pryrezki ziamli ŭ nas nia było, dyk chutary wyjšli chiba tolki dla zabaŭki, bo dla haspadarki jany nie padchodziać.

Prypaminałasia ciapier našym sialanam wiaskowaje žyćcio, bo jano było i wiesialejšaje i prastarniejšaje, čymsia na chutarach, choć było takoje-ž na paławinu hałodnaje, jak i ciapier.

Ale našyja sialanie ciarpliwyja i pracawityja, dyk pracujuć i ciarpliwa čakajuć lepšaha dla siabie času.

Najhoršaja biada ŭ nas, što niama apału, a biez apału toje samaje, što i biaz chleba. U nas było krychu swajho lesu i z jaho sialanie mieli paddzieržku, ale padčas kamasacyi les treba było źniać.

Chutaryzacyja dobraja reč, ale treba jaje ŭmieła prawodzić. Z chutaryzacyi nia možna rabić zabaŭki dla stałych ludziej, jakija na chutaroch nia mohuć zabaŭlacca, ale pawinny i choćuć pradukawać chleb. Dziela hetaha treba padčas chutaryzacyi prawodzić i nadzieły ziamloj małaziamielnyja haspadarki da poŭnaziamielła — treba chutaryzacyju prawodzić tolki z pryrezkaj ziamli. Pryhetym treba prydzialać chutarščykom les, dzie jany mahli-b dastawać apał i nieabchodnaje dzierawa na budoŭlu i inšyja haspadarčyja patreby.

Ahułam kažučy, hetkaja chutaryzacyja, jak prawiedziena ŭ nas, ziamielnaj sprawy nie wyrašaje, a tolki časowa adwaročwaje ŭwahu sialan ad patreby sapraŭdnaj ziamielnaj reformy.

Chutarščyk.

USIACYNA

Hałoŭnyja padstawy wybaraŭ sołtysaŭ.

Sołtysa i padsołtysa wybiraje hramadzkaja Rada; wyniatkawa — u małych hramadach wybiraje ahulny schod hramady. Wybary adbywajucca hałasawańniem za adnaho z padanych kandydataŭ; hałasawańnie adbywajecca miascowym zwyčajem — padymańniem ruki, i može być hałasawańnie tajnaje na žadańnie dziesiatai čašci wybarščykaŭ.

Padawańnie kandydataŭ na sołtysa i padsołtysa adbywajecca wusnaj zajawaj abo na piśmie piataj častki usich hramadzkich radnych.

Na sołtysa budzie wybrany toj kandydat, jaki atrymaje najbolš hałasoŭ, a na padsołtysa — katory atrymaje najbolš hałasoŭ pa pieršym wybranym na sołtysa. Kali-ž padana tolki dwuch kandydataŭ, dyk hałasawańnie nie adbywajecca i tady pieršy kandydat budzie sołtysam, a druhi padsołtysam.

Dzień wybaraŭ i staršyniu wybarnaha schodu wyznačaje pawietawaje starastwa. Staršynia wybarnaha schodu musić pawiedamić ab wybarach sołtysa wybarščykaŭ — hramadzkich radnych najmienš za try dni pred wybarami. Kab wybary byli ważnyja treba, kab na schodzie wybaraŭ było najmienš paławina hramadzkich radnych.

Skarhi na niaprawilnaść wybaraŭ treba padawać tolki ŭ praciahu troch dzion paśla wybaraŭ; skarha musić być naležna ŭmatywawanaja z žadańniem pryznać wybary niaważnymi i padpisana najmienš piataj čaściaj usich hramadzkich radnych, skarhu treba adrasawać pawietawamu starastwie praz wojta swajej wołaści.

Treba wiedać, što ciapier nie abawiazwaje zakon, kab sołtys i padsołtys umieli hawaryć i pisać papolsku; sołtysam moža być i toj čaławiek, jaki papolsku nia ŭmieje ani čytać, ani pisać i hawaryć. U wołaści i wa ŭsich dziaržaŭnych i samaŭradawych ustanowach u našym Krai možna hawaryć i padawać na piśmie padańni pabiełarusku.

Pryhetym padajom, što zakonny lik radnych u hramadzie hetki: u hramadzie da 500 žycharoŭ 12 radnych, zwyš 500 da 1000 žycharoŭ —16 radnych, zwyš 1000 da 1500—20, zwyš 1500 da 2000—24 i zwyš 2000— 30.

Ab kupli ziamli.

Wiedama, što našaje, biełaruskaje sialanstwa ŭ bolšaści małaziamielnaje; wiedama, što kožny biełaruski sielanin imknieсса pašyryć swoj zahon — damahajecca sprawiadliwaj ziamielnaj reformy i adnačasna starajecca z apošnich sił, koštam zdaroŭja celaj swajej siamji, zaciskajučy dziahaj žywaty, prykupić ziamielki.

Redka dzie ŭdajecca našamu sielaninu „začapicca" za „nowuju" ziamlu, ale kali i ŭdajecca, dyk i tady spatykajucca wialikija trudnaści farmalnaha charaktaru, jakija ciahnuć za saboj i matarjalnuju stratu.

Woś-ža dziela hetaha, prystupajučy da kupli ziamli, treba naŭpierad zapytacca ŭ ziamielnaha kamisara pry pawietawym starastwie ab hetkich sprawach: 1) ci ŭłada dała dazwol na parcelacyju taho dwara, falwarku ci jakoha inšaha abjektu, z katoraha ŭłaśnik pradaje zainteresawanamu častki abšaru, 2) ci hety abšar wolny ad serwitutaŭ, daŭhoŭ i inšych załažeńniaŭ, zroblenych ułaśnikam, 3) ci ŭłaśnik-pradawiec maje paŭnamoctwy likwidawać prywatnyja daŭhi, 4) kamu i dzie možna dawać zadatak, kab paśla nia było kłopatu pry zaklučańni kupčy.

Hultajski paniadziełak

Niejkaje dziŭnaje pačućcio ahartaje nas u paniadziełak. Mnohim u paniadziełak nia chočacca pačynać swajej pracy, ale nia ŭsim hetak i nie zaŭsiody. Jošč ludzi, što jak pačnuć swoj tydzień paniadziełkam, to rabota ŭ ich až kipić až da niadzieli, a jošč takija, što i paniadziełak marnujuć i aŭtorak. Hultajski paniadziełak bywaje ŭ tych, chto ŭ niadzielu „pierapracujecca," a zmučyŭšysia niadzielaj, u paniadziełak jon pracawać nia moža. Užo ad niadzieli zaleža, jakim chto pakažycca ŭ paniadziełak. Kali ŭ niadzielu budzie chto čwiarozy i dobra adpačyŭšy, dyk jon u paniadziełak pieršy rabotnik. Za niadzielu jon nažbiraŭ enerhii da pracy, u jaho abdumana rabota, jon uwieś sam i dušoj i ciełam uparadku, jon čakaje tolki paniadziełka, a jak hety pryjdzie, tady čaławiek toj z siłaj kidajecca na swaju rabotu i trywaje pry joj cely tydzień. A heta mnoha značа, jak raspačać tydzień! Mnoha času marnujuć ludzi ŭ paniadziełak! Jošč ludzi, što paniadziełkami padchmialajucca. Heta sprawa tady jšče horšaja, bo taki čaławiek nie rebotnik i ŭ aŭtorak.

U biełaruskaj chacie paniadziełak bywaje i ščaśliwy i niešcaśliwy. Zapeŭnić sabie ščaśliwy paniadziełak, dyk heta značа pawažna prawiaści niadzielu. Chto ŭ niadzielu dobra adpačynie dušoj i ciełam, toj da paniadziełku jošč pryhatawany, značycca— ŭ jaho rabota dobra pojdzie. Ludzi kažuć, što dobry pačatak — heta pałowina raboty zroblena. Toje samaje jošč z našymi paniadziełkami. Dobry paniadziełak, dyk dobry ŭwieś tydzień!

Niawiedama, čamu ludzi prywykli ŭważać kožny paniadziełak za niešcaśliwy. Ale-ž heta nie zaŭsiody tak bywaje. Paniadziełki bywajuć dla ludziej i duža ščaśliwyja. Napryklad, kali jakaja ŭsia siamja ŭ paniadziełak stanawicca da pracy i rabotu swaju wiadzie ŭzhodzie, dyk dla takoj siamji paniadziełak heny jošč najščaśliwiejšym. I naadwarot, kali bačka jakoj siamji, abo jaho syn u paniadziełak z jakoj niebudź pryčyny akažacca da pracy niazdolnym, tady dla siamji henaj taki paniadziełak sapraŭdy budzie niešcaśliwym.

Ja nadta chaču, kab zaŭsiody ŭsie biełarusy pačynali tydzień dobra, kab paniadziełki našy byli dla nas ščaśliwymi, kab biełaruskija bački razam z dziećmi ŭ zhodzie ŭ paniadziełki da pracy wystupali. Heta nie paniadziełki winawatyja ŭ tym, što jany dla nas bywajuć niešcaśliwymi. Winawatyja ŭ hetym my sami. Celuju noč z niadzieli na paniadziełak niachaj chto nie paśpić, dyk ci-ž moža jon tady być rabotnikam u paniadziełak?

Oj, biełarusy, hladziecie i starajciesia, kab paniadziełki wašy nia byli hultajskija! Ad ščaśliwaha paniadziełku zaleža i naša ščaście. Dyk ad kožnaha paniadziełku pačynajma budawać swajo ščaście!

W. D—a

УВАГА! УВАГА!

Сёлета выйшлі з друку ўжо чатыры нумары беларускага літаратурна-навуковага квартальнага часапісу

„КАЛОСЬСЕ"

Друкуецца ящчэ дадатковы нумар, які прысьвячаецца юбілею 30-х угодкаў літаратурнай працы народнага паэта Якуба Коласа. Гэты юбілейны нумар выйдзе з друку ў першай палавіне месяца сьнежня.

Кожны Беларус павінен „Калосьсе" выпісываць, а асабліва атрымаць Коласаўскі нумар.

Складка на „Калосьсе" у год—2 зл.
„ асобны нумар —50 гр.

Парупцеся прысылаць складкі!

Найлепш прысылаць складкі разрахунковым пераказам, які можна дастаць на кожнай пошце і кашту
е экземпляр 1 грош. Пересылка гэткім спосабам грашэй найтанейшая

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі „Калосься:" Вільня, Завальная 1—2.

Адміністрацыя „Калосься."

Redaktar A. Dasiukiewič
Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2.
Wydawiec A. Šutowič